Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

30 ЛІСТАПАДА 2012 г. ПЯТНІЦА № 231 (27346) Кошт 1300 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



«Руская чайная машына» — такім афіцыйным словазлучэннем у Еўропе называлі самавар, адзін з галоўных электрапрыбораў на кухні дзесяцігоддзі таму.

СТАР. 6



У Доме культуры аграгарадка Касцюшкавічы Крычаўскага раёна спяваюць старадаўнія песні і робяць навамодных лялек, спалучаючы традыцыйнае і сучаснае.

СТАР. 8



На вяршыні тэніснага алімпу сезон завяршыла Вікторыя Азаранка. Яшчэ ў самым пачатку 2012 года Віка літаральна ашаламіла ўвесь тэнісны свет, выйграўшы свой першы тытул Вялікага шлема ў Аўстраліі.

СТАР. 8

## 2013 ГОД АБ'ЯЎЛЕНЫ Ў БЕЛАРУСІ ГОДАМ БЕРАЖЛІВАСЦІ

**Адпаведны ўказ № 537 кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка падпісаў 29 лістапада, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.**

«Год беражлівасці стане лагічным працягам рэалізацыі Дырэктывы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 14 чэрвеня 2007 года № 3 «Эканомія і беражлівасць — галоўныя фактары эканамічнай бяспекі дзяржавы ў сучасных умовах», — адзначылі ў прэс-службе.

Урадам будзе зацверджаны рэспубліканскі план мерапрыемстваў па правядзенні ў 2013 годзе Года беражлівасці, а рэспубліканскімі органамі дзяржаўнага кіравання, аблвыканкамамі, Мінскім гарвыканкамам — адпаведныя галіновыя і рэгіянальныя планы.

Правядзенне Года беражлівасці будзе садзейнічаць вырашэнню задач удасканалення арганізацыі вытворчасці, павышэння прадукцыйнасці працы, якасці прадукцыі і паслуг за кошт аптымізацыі выдаткаў, рацыянальнага выкарыстання рэсурсаў, выключэння ўсякага роду неабгрунтаваных страт, у першую чаргу шляхам мадэрнізацыі вытворчасці, укаранення новых тэхналогій, тэхнікі і спосабаў гаспадарання. Мерапрыемствы гэтага года таксама накіраваны на выхаванне ў кожнага пачуцця гаспадарлівасці, стымуляванне эканоміі і беражлівасці як на сваіх працоўных месцах, так і ў паўсядзённым жыцці.

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

## «ДЗЯРЖАВА БУДЗЕ ДАПАМАГАЦЬ БУДАВАЦЬ ЖЫЛЛЁ ТОЛЬКІ ТЫМ, ХТО Ў ГЭТЫМ МАЕ ПАТРЭБУ»

**ПРЭЗІДЭНТ Беларусі на ўчарашняй нарадзе па пытаннях развіцця жыллёвага будаўніцтва ў Мінску выказаў шэраг крытычных заўваг у дачыненні да тэмпаў і прадукцыйнасці працы ў будаўнічай сферы Беларусі, перадае БЕЛТА.**

«Я катэгарычна незадаволены тэмпамі будаўніцтва жылля і наогул будаўніцтва ў нашай краіне. Да гэтага мы яшчэ вернемся. І вельмі шкада, што пры гэтым мы можам страціць вельмі шмат як чыноўнікаў, так і будаўнікоў», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт адзначыў, што, як яму дакладваюць, колькасць будаўнікоў зменшылася прыкладна на 8% у параўнанні з лепшымі часамі. Гэтым, у тым ліку, тлумачыцца зацягванне тэрмінаў будаўніцтва. «У нас у 3-5 разоў прадукцыйнасць працы ў будаўніцтве ніжэй, чым у Еўропе. Гэта сведчыць аб тым, што ў нас лішнія людзі на тых будоўлях, якія мы выконваем. Таму трэба паглядзець, як мы будуем, якая там арганізацыя, якая заработная плата, — заўважыў кіраўнік дзяржавы. — Па маіх назіраннях, калі будуе заможны прыватнік, там дзень і ноч працуюць людзі, таму што яны арганізавалі нармальна працу і плацяць годную зарплату. І лішніх людзей, бязладнасці там няма». Як лічыць Прэзідэнт, неабходна больш шырока прыцягваць да жыллёвага будаўніцтва прыватны бізнэс. «Шчыра скажу, па аб'ектыўных прычынах дзяржава не можа ў ранейшых аб'ёмах фінансаваць жыллёвае будаўніцтва. Неабходна адшукваць альтэрнатыўныя крыніцы, больш шырока прыцягваць прыватны бізнэс, прадстаўнікі якога тут прысутнічаюць. Яны, дарэчы, бралі на сябе пэўныя абавязацельствы, і сёння я хацеў бы пачуць ад іх і ад мэра Мінска, як яны выконваюцца», — заявіў Прэзідэнт.

Ён звярнуў увагу на некаторыя праблемы ў развіцці Мінска, якія абвастрыліся. Адна з іх — невыкананне заданняў жыллёвага будаўніцтва. «Не сакрэт, што ў цяперашніх умовах перыяд чакання грамадзян у чарзе складае больш за 20 гадоў. Калі тэмпы жыллёвага будаўніцтва не нарасціць, то гэты тэрмін павялічыцца яшчэ больш», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. «На жаль, стала сістэматычным парушэнне нарматыўных тэрмінаў будаўніцтва, — працягнуў беларускі лідар.

СТАР. 2

Анатоль ТОЗІК:

## «НЯПРОФІЛЬНУЮ ПАДРЫХТОЎКУ ТРЭБА СПЫНІЦЬ»

**ПРАПАНОВУ разгледзець пытанне аб спыненні з наступнага года набору на няпрофільныя для ўстаноў адукацыі спецыяльнасці агучыў на калегіі Міністэрства адукацыі, прысвечанай падвядзенню вынікаў апошняй прыёмнай кампаніі, віцэ-прэм'ер беларускага ўрада Анатоль ТОЗІК:**

— Я лічу, што трэба не проста скарачаць набор на такія спецыяльнасці, а ўвогуле яго спыняць. У нашай краіне дастаткова навучальных устаноў, якія могуць падрыхтаваць высокапрафесійныя кадры па адпаведным профілі.

СТАР. 2

■ Гаспадары



## «Дзеля іх я пакінула горад...»

**ТАК гаворыць Марыя АЛЯКСЕЕВА, гладзячы бела-чорную грыву каня, і дадае, што яшчэ з маленства марыла ездзіць конна, удзельнічаць у спаборніцтвах...**

**Пакуль на падворку ў маладой сям'і Аляксеевых гадуюцца толькі два рахманыя памочнікі — Малыш і Леана, але ў планах — разводзіць коней, нават мець свой табун. Што цалкам рэальна, бо ў Рэчыцкім аграрным каледжы Марыя набыла прафесію ветэрынара, атрымала накіраванне ў гаспадарку «Міхайлаўскі-агра». Гадуе дачушку Святлану, упраўляецца з хатняй гаспадаркай і нават удзельнічае ў вясковых і раённых мерапрыемствах. На апошнім першынстве «Уладар сяла» Светлагоршчыны сям'я Аляксеевых была ў ліку пераможцаў, бо Марыя здолела прадэманстраваць самы высокі клас верхавой язды.**

**І хто паверыць, што вырасла гэтая «ўладарка» на асфальце, сярод светлагорскіх шматпавярховікаў?**

**Нядаўна Аляксеевым далі асобны дом з ладным кавалкам зямлі, на якім хопіць месца для сапраўднага табуна.**

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Міхаіл СВІСТУН, намеснік дырэктара УП «Белтэхагляд»:**

***«Сёння ў краіне ёсць ужо чатыры аўташколы, якія вучаць кіраванню інвалідаў-калясачнікаў. Павелічэнне іх колькасці залежыць ад попыту на гэты від паслуг. Такія школы патрабуюць дадатковых выдаткаў, абсталявання, аўтамабіляў, а калі попыт будзе нізкім, то яны ніколі не акупяцца. Праводзілася сацыялагічнае даследаванне сумесна з абласнымі камітэтамі па сацабароне, ці жадаюць людзі з абмежаванымі магчымасцямі навучацца кіраванню. На гэты момант патрэбнасці насельніцтва па гэтым пытанні цалкам задавальняюцца».***

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | + 7° |
| Віцебск | + 7° |
| Гомель | + 10° |
| Гродна | + 3° |
| Магілёў | + 8° |
| Мінск | + 7° |

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 30.11.2012 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 8580,00 | ▲ |
| Еўра | 11110,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 276,50 | ■ |
| Укр. грыўня | 1050,18 | ▲ |

Алег ПРАЛЯСКОЎСКІ:

## «ІНТЭРНЭТ ПАВІНЕН БЫЦЬ СВАБОДНЫМ АД САМАВОЛЬСТВА АНАНІМНЫХ ПРАВАКАТАРАЎ І ЗЛАЧЫНЦАЎ»

**У рамках VII Форуму творчай і навуковай інтэлігенцыі дзяржаў — удзельніц СНД, які завяршыў сваю работу ў Туркменістане, міністр інфармацыі Беларусі Алег Праляскоўскі абраны старшынёй Савета па гуманітарным супрацоўніцтве (СГС). Пра першыя крокі на новай пасадзе, а таксама пра ролю Міждзяржаўнага фонду гуманітарнага супрацоўніцтва ў стварэнні гуманітарнай прасторы СНД, Алег Вітольдавіч расказаў часопісу «За рубежом». «Звязда» знаёміць сваіх чытачоў з меркаваннямі Алега Праляскоўскага па гэтай праблематыцы.**



***— У сярэдзіне кастрычніка вы былі выбраны старшынёй Савета па гуманітарным супрацоўніцтве (СГС). Якія вашы першыя крокі на гэтай пасадзе?***

— Мяркую, больш карэктна было б гаварыць пра першыя крокі Савета па гуманітарным супрацоўніцтве ў цэлым па фарміраванні парадку работы СГС і МФГС у 2014 годзе. Гэтыя крокі звязаны, вядома, з правядзеннем VII форуму творчай і навуковай інтэлігенцыі дзяржаў — удзельніц СНД, у рамках якога і адбылося маё выбранне на пасаду старшыні СГС. Ключавым дакументам форуму стала рэзалюцыя, у якой намечаны асноўныя кірункі дзейнасці Савета і МФГС у 2013—2014 гадах. Сярод рашэнняў, якія ўвайшлі ў тэкст рэзалюцыі, я б хацеў адзначыць, перш за ўсё, пацвярджэнне рашучасці дзяржаў — удзельніц СНД распрацаваць сумесную стратэгію развіцця гуманітарнага супрацоўніцтва і прапанову Савету кіраўнікоў дзяржаў абвясціць 2014 год Годам турызму Садружнасці. Нагадаю таксама, што 2013 год у Садружнасці быў абвешчаны Годам экалагічнай культуры і аховы навакольнага асяроддзя ў СНД. У рамках гэтага года ўжо прыняты адпаведны план работы.

***— Як паўплывала на дзейнасць СГС рашэнне кіраўнікоў Расіі, Беларусі і Казахстана аб стварэнні Еўразійскага Саюза?***

— Будзем гаварыць адкрыта: у адносінах нашых трох краін, асабліва ў беларуска-расійскіх адносінах, дасягнуты больш высокі ўзровень інтэграцыі, чым у СНД у цэлым. Але менавіта за шматгалоссе мы і цэнім Садружнасць. Гэта гранічна шырокая дыялогавая пляцоўка, на якой нам удаецца падтрымліваць, узнаўляць і нават аднаўляць наша цывілізацыйнае адзінства. З гэтага пункту гледжання больш шчыльная інтэграцыя асобных удзельнікаў Садружнасці не аказвае вырашальнага ўплыву на працу СГС. Разам з тым, улічваючы, што ўжо падпісаны мемарандум аб паразуменні паміж МФГС і Сакратарыятам Інтэграцыйнага Камітэта ЕўрАзЭС, магчыма, будуць таксама знойдзены новыя формы супрацоўніцтва паміж Саветам і Еўразійскай эканамічнай камісіяй.

***— Які ўплыў на дзейнасць савета аказвае палітыка?***

— Нам у гэтым плане ўдаецца падтрымліваць здаровы баланс: нават самыя сур'ёзныя палітычныя ўзрушэнні апошніх гадоў не спынілі працу па гуманітарным супрацоўніцтве ў рамках Садружнасці. У той жа час задача СГС у тым, каб у любой сітуацыі гуманітарнае супрацоўніцтва было накіравана на ўмацаванне міру і сяброўства паміж нашымі народамі і кіраўнікамі. Таму можна сказаць, што ў Савета ўсё ж ёсць і свая палітычная місія.

***— У задачы СГС, акрамя іншага, уваходзіць і стварэнне агульнай інфармацыйнай прасторы Садружнасці. Што зроблена ў гэтай сферы?***

— З аднаго боку, кожная дзяржава вядзе працу па прапагандзе ідэй Садружнасці, умацаванні добрасуседскіх адносін у сваёй інфармацыйнай прасторы. З другога — ідзе развіццё нашых агульных камунікацыйных пляцовак і інфармацыйнай інфраструктуры. Гэта, перш за ўсё, тэлеканал «Мір», які, на мой погляд, апошнім часам выйшаў на якасна новы ўзровень.

СТАР. 2

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### КОЛЬКАСЦЬ БЕСПРАЦОЎНЫХ У ФРАНЦЫІ ДАСЯГНУЛА МАКСІМУМУ



У Францыі колькасць беспрацоўных у 2012 годзе дасягнула максімуму больш чым за 14 гадоў і склала каля 3,1 млн. чалавек, паведамляюць інфармагенцтвы. У кастрычніку гэтага года колькасць беспрацоўных павялічылася больш чым на 45 тыс. чалавек. Гэта ўжо 18-ы па ліку месяц пагаршэння сітуацыі на французскім рынку працы. Міністэрства працы Францыі паведамляе, што з-за эканамічных праблем дзяржавы колькасць беспрацоўных можа павялічыцца.

### НАЦБАНК УКРАІНЫ ПРЫГРАЗІЎ ЗАКРЫЦЬ БАНКІ, ЯКІЯ НЕ ПРАДАЮЦЬ ДОЛАРЫ

Кіраўнік Нацыянальнага банка Украіны Сяргей Арбузаў паабяцаў пазбавіць ліцэнзіі банкі, якія адмовяцца ад продажу валюты насельніцтву. «Сёння многія банкі прытрымліваюць продаж валюты ўкраінскім грамадзянам. Мы праводзім праверкі. Калі выявім такую сітуацыю, некаторыя банкі страцяць ліцэнзію», — заявіў кіраўнік НБУ.

### КІТАЙ ДА 2015 ГОДА БУДЗЕ ВЫРАБЛЯЦЬ 10% АТАМНАЙ ЭНЕРГІІ Ў СВЕЦЕ



У бліжэйшыя гады ў КНР будзе дзейнічаць 41 ядзерны энергаблок, а сукупная магутнасць кітайскіх АЭС дасягне 42 ГВт. Па словах старшыні Кітайскай асацыяцыі атамнай энергетыкі Чжан Хуачжу, у цяперашні час у Кітаі функцыянуюць 6 атамных электрастанцый, на якіх дзейнічаюць 15 энергаблокаў. Сёння іх доля ў сусветнай атамнай энергетыцы не перавышае 3,5%. У бліжэйшыя гады будзе пабудавана каля 20 новых станцый, што дазволіць Кітаю павялічыць долю краіны ў сусветнай атамнай энергетыцы да 10%.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### СВЕТУ ПРАДКАЗАЛІ РЭЗКІ РОСТ КОЛЬКАСЦІ ПЕНСІЯНЕРАЎ

Колькасць пенсіянераў і іх доля ў агульнай колькасці насельніцтва ў краінах, якія адносяцца да буйнейшых эканомік свету, рэзка ўзрасце на працягу бліжэйшых 8 гадоў. Аб гэтым піша The Financial Times.



Напрыклад, у Германіі цяпер на пенсіі можа разлічваць 21% насельніцтва. Да 2020 года доля гэтых грамадзян вырасце да 23%. У Японіі доля пенсіянераў павялічыцца за 8 гадоў з 24 да 28%. Для параўнання, у 2005 годзе іх было толькі 21%.

Урады шэрагу краін свету (напрыклад, Францыі) спрабуюць процідзейнічаць росту сацыяльнай нагрузкі, паступова павялічваючы пенсійны ўзрост і абмяжоўваючы льготы.

Варта адзначыць, што старэнне насельніцтва і рост долі пенсіянераў тычыцца не толькі развітых краін Еўропы. Так, у Кітаі ў 2007 годзе толькі 8% грамадзян былі старэйшыя за 65 гадоў. Да 2020 года іх стане 12%, а вось доля працаздольнага насельніцтва (ва ўзросце 15-64 гадоў) знізіцца з 73 да 71%. Але яшчэ больш рэзкія змены адбудуцца ў Ганконгу, дзе доля пенсіянераў вырасце з 12 да 18%.

КОРАТКА

Мінгарвыканкам не плануе вяртацца да тэмы льготнага праезду ў грамадскім транспарце для студэнтаў. Аб гэтым паведаміў у час прамой лініі старшыня Мінгарвыканкама Мікалай Ладуцька. Ён падкрэсліў, што ўвядзенне бясплатнага праезду ў мінулым годзе было абумоўлена эканамічнай сітуацыяй. Цяпер умовы змяніліся, і неабходнасці ў такой меры няма. Паводле слоў мэра, у сталіцы для моладзі ёсць магчымасць падзарабіць у свабодны ад вучобы час. Адкрыты вакансіі ў сферы будаўніцтва, аказання паслуг, гандлю і інш.

Беларусь устанавіла нулявую квоту на вытворчасць пладовых мацаваных ардынарных він у 2013 годзе для рэалізацыі на ўнутраным рынку. Такім чынам, вытворчасць гэтай прадукцыі ў рэспубліцы з 1 студзеня 2013 года будзе спынена.

Беларускія адвакаты правядуць па ўсёй краіне 30 лістапада з нагоды Дня юрыста бясплатныя кансультацыі для маламаёмасных. «У асноўным людзей цікавяць пытанні, звязаныя з вылічэннем стажу пры выхадзе на пенсію, працаўладкавання, пытанні сацыяльнай падтрымкі, спадчыны і іншыя», — сказалі ў калегіі адвакатаў.

## ЯКІ ЭПІЗОД З ДЗЯЦІНСТВА ВЫ ЗГАДВАЕЦЕ НАЙЧАСЦЕЙ?



**Аляксандр УДОДАЎ, дэпутат Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце і сувязі:**

Часцей за ўсё згадваю перыяд з 7 па 10 класы. Таму што быў свабодны, бегаў на рыбалку... А эпізод? Аднойчы злавіў карпа вагой каля кілаграма ў возеры, на месцы вялікага кар'ера. Лета, паднімаўся ў 3 гадзіны раніцы, бег шчаслівы... Зараз гэтага возера ўжо няма: на яго месцы пазней пабудавалі Гомельскі завод ліцця і нармаляў.

Яшчэ люблю згадваць, як упершыню пацалаваў дзяўчыну. Гэты было пазней, гадоў у 14.



**Ігар ЧАРГІНЕЦ, намеснік дырэктара Нацыянальнай авіякампаніі «Белавія» :**

Напэўна, як удзельнічаў у Алімпіядзе ў 1980 годзе. Я падаваў мячы. У дзяцінстве сур'ёзна займаўся футболам, і вось мы, юныя футбалісты, падавалі мячы падчас гульняў на нашым стадыёне «Дынама» ў Мінску. Гэта быў вялікі гонар і чароўнае пачуццё свята. А яшчэ нам было даручана ўручыць кветкі кіраўніцтву рэспублікі. Мы падбеглі да трыбуны, і я ўручыў кветкі Пятру Міронавічу Машэраву. А ён мне цукеркі падарыў. Вялікую каробку — кілаграм.



**Наталля КУТУЗАВА, прафесар кафедры паліталогіі і гуманітарных дысцыплін Інстытута парламентарызму і прадпрымальніцтва, кандыдат філасофскіх навук:**

У дзяцінстве мне падабалася глядзець па тэлебачанні, як людзі скачуць з парашутам. Я была маленькая, у школу яшчэ не хадзіла, калі паспрабавала гэтак жа скокнуць з дзіцячай горкі з раскрытым парасонікам у руках. Пры гэтым мы з бацькамі сабраліся на нейкае ўрачыстае мерапрыемства, і я была вельмі прыгожа апранута: белыя калготкі... Надвор'е было дажджлівае... І я скокнула з гэтай горкі ў лужыну. Наступствы былі, вядома, на маёй вопратцы і фізіяноміі. Потым мне ўдалося некалькі разоў скокнуць з парашутам, і я атрымала сапраўднае задавальненне. Але той эпізод як першую спробу ажыццяўлення дзіцячай мары згадваю часта.

**Падрыхтавала Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

## «ДЗЯРЖАВА БУДЗЕ ДАПАМАГАЦЬ БУДАВАЦЬ ЖЫЛЛЁ...»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— З пачатку года колькасць даўгабудаў па жыллі ўзрасла ў 2 разы. Гэта недапушчальна ні для Мінска, ні для іншых рэгіёнаў». Яшчэ адна праблема, пра якую згадаў Прэзідэнт, — нізкая якасць будаўніцтва: «Вялізны паток скаргаў грамадзян. За гэта адкажаце на ўсю катушку». Акрамя таго, узнікаюць праблемы ў пытаннях фінансавання і своечасовага будаўніцтва аб'ектаў інжынерна-транспартнай інфраструктуры ў раёнах жылой забудовы.

Кіраўнік дзяржавы таксама адзначыў недахоп тэрыторый у гарадской мяжы. «Адразу хачу адзначыць, што забяспечыць усіх мінчан жыллём у гарадской мяжы ўжо немагчыма, ды і не патрабуецца. На гэты конт мае рашэнні вядомыя. Прашу іх выконваць, — запатрабаваў Аляксандр Лукашэнка. — Па шчыльнасці засялення Мінск у паўтара-тры разы перасягнуў такія еўрапейскія сталіцы, як Берлін, Вена, Рым, Прага і Стакгольм. Таму больш аптымальным будзе пошук іншых шляхоў забудовы». «Мы ўключылі ў гарадскую рысу частку земляў Мінскага раёна, як гэта было і з Зялёным Борам, пра які пойдзе гаворка. Але такі падыход мае свае абмежаванні. Нам ні ў якім разе нельга выводзіць з абароту сельскагаспадарчыя ўгоддзі», — адзначыў Прэзідэнт.

У той жа час Прэзідэнт Беларусі заявіў, што дзяржава будзе дапамагаць будаваць жыллё толькі тым, хто ў гэтым мае патрэбу. «Яшчэ раз хачу падкрэсліць, што трэба адкінуць надзеі на тое (гэта грамадзян тычыцца), што дзяржава ўсім пабудуе жыллё, кватэры, дамы, гэтак жа як і на тое, што дзяржава ўсім дасць льготныя крэдыты пад 5%. Дзяржава павінна дапамагчы тым, хто гэта не можа рабіць. Усім астатнім трэба зарабляць грошы і іх укладваць, у тым ліку і ў будаўніцтва жылля», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

## «НЯПРОФІЛЬНУЮ ПАДРЫХТОЎКУ ТРЭБА СПЫНІЦЬ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Няма ніякай неабходнасці ў Смілавіцкім дзяржаўным аграрна-тэхнічным каледжы рыхтаваць навучэнцаў па спецыяльнасці «Правазнаўства» з прысваеннем выпускнікам кваліфікацыі «юрыст», або ў ветэрынарнай акадэміі рыхтаваць спецыялістаў па праблемах дзяржаўнага кіравання. Можна прывесці мноства такіх прыкладаў. Так навошта мы гэта робім? А затым вашы праверкі паказваюць, што да 50% студэнтаў маюць веды ніжэй за ніжэйшую планку! Хачу спытаць вас: навошта нам патрэбныя такія спецыялісты і навошта нам дыскрэдытаваць нацыянальную сістэму адукацыі?

Анатоль Тозік лічыць, што трэба дзейнічаць больш рашуча:

— Перад намі стаіць надзвычай актуальная задача — аптымізацыя выдаткаў у бюджэтнай сферы. Мы пачалі з саміх сябе — з дзяржаўнай службы. Але на наступны год нам трэба правесці вельмі сур'ёзную работу і ў бюджэтнай сферы ўвогуле, і, у прыватнасці, у сферы адукацыі. У нас шмат лішніх людзей сёння працуе ва ўстановах адукацыі. Літаральна побач працуюць аднатыпныя ўстановы адукацыі, якія, праўда, адносяцца да розных ведамстваў, прычым і тыя, і другія не дабіраюць навучэнцаў і не могуць укамплектавацца. Я прашу пры аптымізацыі сеткі ўстаноў адукацыі не звяртаць увагу на неабгрунтаваныя ведамасныя і тэрытарыяльныя інтарэсы. У галіне адукацыі галоўнае ведамства — гэта Міністэрства адукацыі, таму, у чыім бы падпарадкаванні ні знаходзілася навучальная ўстанова, усе яны павінны працаваць пад дырыжорскай палачкай Міністэрства адукацыі.

Анатоль Тозік канстатаваў, што ўрад асабліва трывожыць сітуацыя з падрыхтоўкай педагагічных кадраў. У 1990 годзе ў беларускіх школах навучалася больш як 1,5 млн дзяцей, у школах працавалі 123 тысячы настаўнікаў, а штогод выпускаліся 4 700 педагогаў. У гэтым годзе ў нас налічваецца ўсяго 912 тысяч школьнікаў, у школах працуюць 132 тысячы настаўнікаў. А мы выпусцілі, з улікам платнай формы навучання, каля 10 тысяч педагогаў.

— Міністэрства адукацыі збіраецца ў наступным годзе скарачаць прыём. Але рабіць гэта трэба паралельна з іншымі мерамі: напрыклад, па тых спецыяльнасцях, дзе рыхтуюць матэматыкаў і фізікаў, якіх у школе па-ранейшаму не хапае, павышаць студэнтам стыпендыі.

Анатоль Тозік таксама пацікавіўся, як Міністэрства адукацыі распарадзілася незапоўненымі бюджэтнымі месцамі ў ВНУ:

— Мы ж дамаўляліся з вамі разглядзець магчымасць пераводу на бюджэтную форму навучання лепшых студэнтаў-платнікаў з умовай, што пасля заканчэння навучання яны будуць размеркаваныя. Чаму гэта не было зроблена?

Анатоль Тозік падкрэсліў, што бюджэтная падрыхтоўка сёння, у прынцыпе, задавальняе патрэбы эканомікі ў кадрах, таму платнае навучанне не можа і не павінна быць стратным ці субсідзіравацца з бюджэту, як гэта адбываецца сёння.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

■ Парламенцкі дзённік

*Паспрачаліся аднойчы два чалавекі, стоячы пад апельсінавым дрэвам — каму належаць гэтыя апельсіны па праве?*

*— Таму, хто першы іх заўважыў, — сказаў адзін.*

*— Таму, хто ўбачыў у іх выяву сонца, — сказаў другі.*

*Спрэчка была гарачай, але яна не прынесла палёгкі ні першаму, ні другому. Кулакі сціскаліся, вочы выпраменьвалі нянавісць. Кожны хацеў завалодаць апельсінамі, чаго б гэта ні каштавала. На шчасце, праходзіў побач мінак — да яго і звярнулі свае маленні спрачальнікі:*

*— Рассудзі нас!*

*— Для чаго кожнаму з вас гэтыя апельсіны? — гэта ўсё, пра што спытаў мінак.*

*— Мне, — сказаў адзін, — патрэбна іх спелая мякаць, каб мае госці змаглі ўдосталь ёй паласавацца на вяселлі дачкі.*

*— Мне патрэбна іх сакавітая лупіна, каб прыгатаваць з яе цукаты на вяселле сыну — прамовіў іншы.*

*Нічога не сказаў мінак, нічога не сказалі два стомленыя чалавекі... Вочы ўсіх траіх праяснелі, і светлымі зрабіліся іх твары.*



Фота Надзеі БУЖАН.

## А МЕДЫЯТАР ХТО?

### У ніжняй палаце парламента перад другім чытаннем абмеркавалі папраўкі ў законапраект «Аб медыяцыі»

Гэтая вядомая ў асяроддзі юрыстаў гісторыя найлепш дэманструе сутнасць медыяцыі як спосабу вырашэння спрэчкі: інтарэсы абодвух бакоў маюць права на існаванне і нават могуць быць задаволеныя адначасова. Але не заўсёды ўдзельнікі спрэчкі здольныя самастойна гэта асэнсаваць і менавіта тут ім на дапамогу прыходзіць медыятар, або пасярэднік, у асобе якога яны бачаць аўтарытэтную непрадузятую асобу, здольную дапамагчы ім зірнуць на сутнасць спрэчкі збоку.

У нашай краіне медыяцыя прымянялася задоўга да таго, як гэта слова сталі выкарыстоўваць юрысты, і ўжо гады два да яе як да нормы актыўна звяртаюцца беларускія гаспадарчыя суды, але закон «Аб медыяцыі» пакуль не ўступіў у сілу. Зараз ён дапрацоўваецца ў ніжняй палаце парламента. Тры асноўныя заўвагі да яго праекта былі нядаўна разгледжаны падчас пасяджэння адпаведнай працоўнай групы ў Палаце прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

— Гэты закон патрэбен у першую чаргу нашым грамадзянам і юрыдычным асобам. Бо медыяцыя — гэта выпрацоўванне прымальнага для абодвух бакоў пагаднення з дапамогай пасярэдніка. Самая галоўная перавага медыяцыі ў тым, што гэта — урэгуляванне спрэчкі да суда, дзе забяспечана канфідэнцыяльнасць, — лічыць **дэпутат Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па заканадаўстве Наталля ГУЙВІК.** — У сваёй судовай практыцы я, звяртаючыся, па сутнасці, да медыяцыі (хоць і не ведаючы гэтага) захавала дзясяткі сем'яў. Такое магчыма, калі глядзець на спрэчку не столькі вачыма правазнаўцы, колькі вачыма псіхолага. Дастаткова выслухаць кожнага паасобку, што ён лічыць сапраўднай прычынай, скажам, разводу, і потым абмеркаваць гэту прычыну разам, каб бакі пачулі адзін аднаго, зразумелі і знайшлі магчымасць памірыцца і захаваць сям'ю. Калі пасля такой работы сем'і забіраюць іскі аб разводзе, нараджаюць дзяцей і запрашаюць цябе быць хроснай маці, гэта дарагога варта!

Прынцыповае адрозненне медыятара ад суддзі ў тым, што ён не ўнікае ў сутнасць спрэчкі. У медыятара і ў суддзі розныя мэты. Суд абавязаны абараняць правы і інтарэсы, якія ахоўваюцца законам, а справа медыятара — стварыць умовы для таго, каб бакі пачулі адзін аднаго і самі прапанавалі прымальнае для кожнага пагадненне. Важна, што медыятар не прапаноўвае свае варыянты і не падказвае выхад, ён толькі ўмела кіруе перамовамі. У цэнтры ўвагі медыятара не спрэчка, а канфлікт, які належыць вырашыць. Дасягненне медыяцыі — не толькі ўзаемавыгадная для спрачальнікаў дамова, але і захаванне паміж імі добрых адносін.

**Дастаткова выслухаць кожнага паасобку, што ён лічыць сапраўднай прычынай, скажам, разводу, і потым абмеркаваць гэту прычыну разам, каб бакі пачулі адзін аднаго, зразумелі і знайшлі магчымасць памірыцца і захаваць сям'ю. Калі пасля такой работы сем'і забіраюць іскі аб разводзе, нараджаюць дзяцей і запрашаюць цябе быць хроснай маці, гэта дарагога варта!**

Медыяцыя заклікана палегчыць нагрузку на беларускія суды, захаваць партнёрскія (сямейныя або проста цывілізаваныя) адносіны паміж спрачальнікамі, а таксама эканоміць іх, спрачальнікаў, грошы, час і нервы. Законапраект «Аб медыяцыі» не прадугледжвае выплату абавязковай судовай пошліны памерам у 5% ад цаны іску. А гэта можа быць вельмі сур'ёзная сума, калі размова, скажам, ідзе пра падзел маёмасці (цана судовага іску роўная кошту ўсёй маёмасці, якая прадстаўлена для падзелу). «Падчас звароту ў суд не кожны можа аплаціць такую суму, спрэчка застаецца нявырашанай і ў выніку былыя муж і жонка робяцца ворагамі на ўсё астатняе жыццё», — заўважыла Наталля Гуйвік. Законатворца мяркуе, што аплата паслуг медыятара будзе параўнальна невялікай, да таго ж спрачальнікі будуць аплачваць яе роўнымі долямі.

Канфідэнцыяльнасць — таксама вельмі значны аспект медыяцыі. Падчас судовага разбору ўсе сакрэты бізнэсу альбо інтымныя падрабязнасці сямейнага жыцця робяцца набыткам тых, хто знаходзіцца ў зале суда, і хутка распаўсюджваюцца за яе межы, што яшчэ больш аддаляе спрачальнікаў адзін ад аднаго або шкодзіць іх інтарэсам. Законапраект «Аб медыяцыі» прадугледжвае, што медыятар абавязаны захоўваць у тайне пачутае ад бакоў.

— Узаемавыгаднае вырашэнне канфліктаў і ёсць паказчык цывілізаванага грамадства, — сказала дэпутат. — Калі людзі навучацца не толькі слухаць, але і чуць адзін аднаго, у нас будзе менш нянавісці, крыўдаў і зайздрасці.

Праект будучага закона змяшчае адрозненне медыятыўнага пагаднення ад міравога. Міравое пагадненне зацвярджаецца ў судовым працэсе, тлумачаць юрысты, і суддзя можа накіраваць бакі, патлумачыць, падказаць змест. У выніку бакі спачатку пагаджаюцца, але, бывае, потым пішуць скаргу, бо не самі прынялі гэта рашэнне, а па падказцы. Медыяцыя мае на ўвазе, што бакі самі выпрацоўваюць умовы свайго пагаднення і самі яго заключаюць. Таму яны ў большай ступені зацікаўленыя ў яго выкананні.

Аднак захаванне прынцыпу добраахвотнасці выканання медыятыўнага пагаднення можа зрабіць яго нежыццядзейным, асцерагаюцца правазнаўцы. У Расійскай Федэрацыі медыяцыя, нягледзячы на тое, што адпаведны закон быў прыняты яшчэ ў 2010 годзе, не карыстаецца поспехам, бо прымусовае выкананне медыятыўнага пагаднення там не прадугледжана. У праекце беларускага закона аб медыяцыі прапісаны механізм прымусовага выканання ўзаемнай дамоўленасці. Калі медыятыўнае пагадненне не выконваецца добраахвотна, адзін з бакоў зацвярджае пагадненне ў судзе, і яно робіцца абавязковым.

Галоўным жа чынам поспех медыяцыі залежыць ад прафесіяналізму медыятара, пагаджаюцца эксперты. Пры гэтым найбольш каштоўнымі тут з'яўляюцца не юрыдычныя, а псіхалагічныя веды, уменне ўлічыць інтарэсы кожнага. Праект беларускага закона аб медыяцыі прапісвае бесстароннасць і незалежнасць медыятара.

Праект закона аб медыяцыі быў разгледжаны Нацыянальным сходам Беларусі і прыняты ў першым чытанні ў чэрвені гэтага года. Падчас падрыхтоўкі дакумента да другога чытання ў парламенце найбольшыя спрэчкі выклікалі тры яго нормы: арганізацыя дзейнасці медыятараў, прававая прырода медыятыўнага пагаднення, не зацверджанага судом, і спецыяльныя веды, якімі абавязаны валодаць медыятар. Для таго, каб выпрацаваць новую рэдакцыю адпаведных артыкулаў законапраекта, створана дадатковая працоўная група, у якую ад Палаты прадстаўнікоў увайшла Наталля Гуйвік. Свае прапановы працоўная група павінна прадставіць у парламент да канца снежня. Другое чытанне праекта закона аб медыяцыі запланавана на вясновую сесію 2013 года.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА** ■

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

## ТРАДЫЦЫЙНЫЯ ЗНІЖКІ ДЛЯ ЛЮДЗЕЙ З ІНВАЛІДНАСЦЮ

Як паведамілі ў камітэце па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама, сталічныя арганізацыі да Дня інвалідаў прапануюць зніжкі на аказанне бытавых паслуг.

Ужо з 1 лістапада праводзіць бясплатнае абслугоўванне людзей з абмежаванымі магчымасцямі сацыяльная цырульня «Арт Дын». З 28 лістапада па 5 снежня таварыства «Белаўтахімсэрвіс» прапануе людзям з інваліднасцю і ўдзельнікам Вялікай Айчыннай вайны паслугі хімчысткі, пральні за 50% кошту. Майстэрня «А-7» у лістападзе-снежні знізіла для гэтай катэгорыі наведвальнікаў цану на рамонт тэлерадыёапаратуры, бытавой тэхнікі на 5%.

З снежня інваліды змогуць бясплатна наведаць трэнажорныя залы ў некаторых спартыўных аб'ектах, зрабіць прычоску, педыкюр, манікюр, атрымаць 20-працэнтную зніжку на выраб мастацкага фота ў закрытым акцыянерным таварыстве «Вілія». На адной са сталічных станцый тэхабслугоўвання ў снежні на працягу 15 дзён будзе арганізавана бясплатная дыягностыка падвескі аўтамабіляў, якія належаць людзям з інваліднасцю. У цэлым, на некаторых прадпрыемствах (у цырульнях, абутковых майстэрнях, майстэрнях па пашыве і рамонце адзення) падобныя акцыі доўжацца некалькі тыдняў ці месяцаў.

Усяго амаль 200 крам Мінска прапануюць зніжку з рознічных цэн на харчовыя і нехарчовыя тавары пенсіянерам, шматдзетным сем'ям і інвалідам у памеры 3% у ранішні час. Для атрымання зніжкі пакупніку неабходна прад'явіць арыгінал пенсійнага пасведчання, пасведчанне шматдзетнай сям'і або пасведчанне інваліда.

**Святлана БУСЬКО.**

## ЁСЦЬ ПРАПАНОВЫ — ВЫКАЖЫЦЕ

З 1 па 15 снежня Міністэрства транспарту і камунікацый праводзіць віртуальнае апытанне тураператараў і турыстаў адносна праблем і пытанняў, звязаных з транспартным забеспячэннем тураў па Беларусі і за яе межамі. Водгукі і канкрэтныя прапановы па арганізацыі транспартнага забеспячэння тураў усе ахвотныя могуць накіраваць не пазней 15 снежня на спецыяльны электронны адрас: virtopros@gmail.com.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## ПАСЛЯ ПРАЦЫ КРАЎ ФАРЫ. І ВЫРАБЛЯЎ НАРКАТЫЧНЫЯ РЭЧЫВЫ

38-гадовы работнік адной са сталічных станцый тэхнічнага абслугоўвання, рамантуючы чарговы аўтамабіль, звярнуў увагу на тое, што зняць фары з аўтамабіля «Сітраен-Пікаса» дастаткова проста...

Літаральна ў той жа вечар «вынаходнік» зняў заднія фары з аўтамабіля вышэйназванай маркі, прыпаркаванага па вуліцы Андрэеўскай. І прадаў іх праз інтэрнэт за 30 долараў ЗША. У далейшым зламыснік паспеў такім жа чынам «папрацаваць» на вуліцах Слясарнай, Убарэвіча, Аэрадромнай, у раёне Чэрвеньскага рынку. Усё скрадзенае мужчына складзіраваў у гаражы ў пасёлку Стайкі, які арандаваў.

— У выніку міліцэйскай аперацыі падазроны быў затрыманы ў двары свайго дома. Першапачаткова мужчына адмаўляў сваю віну, аднак агляд яго кватэры і гаража зняў усе сумненні, — расказала прэс-афіцэр Партызанскага РУУС г. Мінска Ганна Чыж-Літаш. — Таксама ў гаражы было знойдзена дзевяць бутэлек экстракцыйнага опію. А ў кватэры затрыманага апаратыўнікі знайшлі газавы пісталет, яшчэ дзве фары і амаль паўтара грама марыхуаны. Высветлілася, што наркатычныя рэчывы мужчына вырабляў для сябе.

## СУТЫКНУЛІСЯ ДВА «КамАЗы»

Дарожна-транспартнае здарэнне адбылося а 6-й гадзіне раніцы ў Гомелі. Абодва грузавікі былі з расійскімі нумарамі. Аднаго з кіроўцаў давялося ратаваць работнікам МНС.

Было ўстаноўлена, што сутыкнуліся «КамАЗы», якія рухаліся ў спадарожным кірунку па вуліцы Рэчыцкая шаша. У адным з грузавікоў заблакіравала кіроўцу. Абодва кіроўцы працуюць у Навазыбкаве Бранскай вобласці. Маладзейшы з іх, 1984 года нараджэння, не пацярпеў, яго машына атрымала нязначныя механічныя пашкоджанні. Старэйшаму вадзіцелю, 1956 года нараджэння, пашчасціла менш: яго даставілі ў бальніцу пасля вызвалення выратавальнікамі з папярэднім дыягназам «пералом правай нагі, чэрапна-мазгавая траўма». У яго «КамАЗа» дэфармаваная кабіна.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## ПОЛЬСКІ ГРУЗАВІК ЗБІЎ ПЕШАХОДА

На аўтадарозе Брэст — Мінск — мяжа РФ, паблізу вёскі Шухаўцы Дубровенскага раёна пешахода насмерць збіў польскі грузавік. Паводле інфармацыі ДАІ, трагедыя адбылася апоўначы. 56-гадовы грамадзянін Польшчы, кіруючы грузавым аўтамабілем «Вольва», здзейсніў наезд на чалавека, які перабягаў праезную частку. Потым высветлілася, што пад колы трапіў 48-гадовы жыхар Оршы. Пешаход ад атрыманых траўмаў памёр на месцы здарэння.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## САМАГОНКА АД САЦЫЯЛЬНАГА РАБОТНІКА

Жыхар Петрыкава арганізаваў падпольны міні-завод, які спецыялізаваўся на «запатрабаваным» вадкім прадукце. 1350 літраў самагоннай брагі і 427 літраў гатовай самагонкі, якія знаходзіліся ў розных ёмістасцях на тэрыторыі домаўладання 40-гадовага мясцовага жыхара, уразілі нават супрацоўнікаў раённага АУС. У прыбудове працавалі тры самагонныя апараты. Як расказаў намеснік начальніка УУС аблвыканкама Валерый Лявонаў, брага захоўвалася ў 45 пластмасавых ёмістасцях, а гатовая самагонка — у пяцілітровых пластмасавых і трохлітровых шкляных слоіках. Цікава, што самагонаварэннем у буйных маштабах займаўся сацыяльны работнік тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

■ Дзеля памяці

## ЖЫЦЦЁ І КІНО ПРАФЕСАРА БОНДАРАВАЙ



«Наш індывідуальны капітал — гэта сума прац самых розных людзей. Вечная аксіёма: «Скажы мне, хто твой настаўнік, і я скажу, хто ты...». Прафесар Бондарава — з тых дзіўных асоб, якія сваім розумам і працай, сваім поглядам, святлом, проста прысутнасцю не дазвалялі нашаму студэнцкаму жыццю быць бязладным... Бондарава дарыла нам ключ, што мастацтва — гэта не адлюстраванне жыцця, часта яно бывае па ўздзеянні мацней за само жыццё...» — напісала Ядзвіга Юферава, намеснік галоўнага рэдактара «Российской газеты», заслужаны работнік культуры РФ, выпускніца БДУ 1971 года пра адну са сваіх выкладчыц — Ефрасінню Леанідаўну Бондараву. Легендарнаму кінакрытыку, доктару філалагічных навук, прафесару Бондаравай сёлета споўнілася б 90 гадоў. У памяць пра яе прайшла міжнародная навуковая канферэнцыя ў Інстытуце журналістыкі БДУ, на якую сабраліся былыя вучні Ефрасінні Леанідаўны, выкладчыкі, навукоўцы з буйных навучальных устаноў Беларусі, вучоныя з Расіі, Украіны, Казахстана.

**Уладзімір ПАНАРАДАЎ, прарэктар па эканоміцы і інвестыцыях Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, кандыдат фізіка-матэматычных навук:**

— Я пазнаёміўся з Ефрасінняй Леанідаўнай гадоў 20 таму. Мы сустракаліся на навуковых канферэнцыях. Мне з ёй было камфортна: вельмі душэўны чалавек. Яна была выпускніцай першага выпуску аддзялення журналістыкі філалагічнага факультэта, але шмат зрабіла для таго, каб гэтае аддзяленне ператварылася ў магутны квітнеючы факультэт, Інстытут журналістыкі. Цяпер тут праходзіць канферэнцыя, прысвечаная гэтаму вялікаму чалавеку, вялікаму кінакрытыку і Настаўніку з вялікай літары. Гэта важна для ўніверсітэта, які жыве ў прадчуванні свайго 100-годдзя. Адметна, што сёння БДУ мае вялікі рэйтынг і журналісты робяць у гэта свой унёсак.

**Дырэктар Інстытута журналістыкі Сяргей ДУБОВІК адзначыў:**

— Сёння мы выйшлі на міжнародны ўзровень у правядзенні навуковых канферэнцый, якія прысвечаны дзейнасці нашых вядомых вучоных, журналістаў, што ўнеслі важкі ўклад у развіццё нашай культуры, журналістыкі, беларускай навукі ў цэлым. Летась у Інстытуце журналістыкі мы адкрылі імянную аўдыторыю Ефрасінні Леанідаўны Бондаравай. Цяпер узгадваем гэтага вялікага чалавека на канферэнцыі. Традыцыя будзе працягвацца, таму што мы сёння — нішто без памяці пра тых, хто заклаў падмурак нашай навукі і падмурак беларускай журналістыкі.

У прафесара Бондаравай было шмат вучняў, якія яе з удзячнасцю ўзгадваюць нават цяпер, калі самі сталі прафесійнымі журналістамі, крытыкамі і навукоўцамі. Як, напрыклад, **Людміла САЯНКОВА, загадчыца кафедры літаратурна-мастацкай крытыкі Інстытута журналістыкі БДУ:**

— Галоўнай прафесіяй для Ефрасінні Леанідаўны заставалася журналістыка. Знакамітыя словы «Ні дня без радка» сталі дэвізам яе жыцця. Яна працавала шмат і з захапленнем. Кожная тэма ці герой выклікалі ў яе шчыры інтарэс. Для яе не існавала малых выданняў. Ефрасіння Леанідаўна пісала з дзіўнай аддачай у раённыя і рэспубліканскія, абласныя і шматтыражныя газеты, у тонкія масавыя і тоўстыя спецыялізаваныя выданні. Яе першыя водгукі на фільмы сталі з'яўляцца ў прэсе ў 50-я гады мінулага стагоддзя. Менавіта гэтае дзесяцігоддзе стала пачаткам развіцця кінакрытыкі як спецыяльнага аналітычнага віду творчасці ў сродках масавай інфармацыі. Яна аўтар многіх манаграфічных выданняў, была аўтарам рэцэнзій на фільмы, якія ў свой час былі пакладзены на паліцу. Але яна рабіла сваю справу з упэўненасцю. Была прыхільніцай беларускіх акцёраў, заўсёды адзначала і падтрымлівала іх працу ў кіно. Ефрасіння Леанідаўна з'яўляецца заснавальнікам беларускай школы кінакрытыкі як самастойнай творчай прафесіі.

Пра тое, як Ефрасіння Бондарава нават уласна кіравала кіно, узгадаў Анатоль Красінскі, доктар мастацтвазнаўства, прафесар. Яна была адным з кіраўнікоў беларускага кіно — некалькі гадоў працавала галоўным рэдактарам Міністэрства культуры Беларусі па пытаннях кінематаграфіі. Працаваць тады было складана: увесь час прыходзілася нешта адстойваць. Але Бондарава сказала сваё слова пра нашу гісторыю, пра нашу сучаснасць, пра наша жыццё. Яна сказала яго з пазіцыі беларуса, з пазіцый і свайго часу, і з пазіцый мінулага.

Кінематографу Ефрасіння Бондарава прысвяціла сваё жыццё і жыццё сваёй сям'і. Муж Ефрасінні Леанідаўны — заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, вядомы беларускі кінааператар Алег Ціханавіч Аўдзееў. Сын Ігар Аўдзееў быў студэнтам факультэта журналістыкі, а цяпер з'яўляецца дырэктарам музея беларускага кіно. А колькі вучняў, якія дагэтуль адчуваюць энергетыку свайго настаўніка — Ефрасінні Леанідаўны Бондаравай!

**Ларыса ЦІМОШЫК** ■

## «ІНТЭРНЭТ ПАВІНЕН БЫЦЬ СВАБОДНЫМ...»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Адзначу, што я заўсёды падтрымліваў імкненне кіраўніцтва Міждзяржаўнай тэлерадыёкампаніі стварыць у дадатак да тэлеканала «Мір» кругласутачны навінавы канал «Мір 24». Да іншых агульных рэсурсаў Садружнасці можна аднесці радыё «Мір» і шматлікія інтэрнэт-пляцоўкі, якія таксама развіваюцца вельмі дынамічна.

***— Якая ваша пазіцыя па пытанні цэнзуры ў інтэрнэце? Ці будзе агульная інфармацыйная прастора сапраўды свабоднай?***

— Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь прымала непасрэдны ўдзел у распрацоўцы захадаў рэгулявання доступу да сеткі інтэрнэт і працы ў ёй, якія былі прыняты ў нашай краіне з 2010 года. Нам прыемна, што і расійскія калегі, і адказныя ведамствы іншых краін пайшлі ў адным кірунку — да чыстага, адказнага і законапаслухмянага інтэрнэту. У рэальным свеце чалавек, які парушыў закон, павінен абавязкова за гэта адказаць. Значыць, гэтак жа павінна быць і ў глабальным сеціве. Інтэрнэт павінен быць свабодным не толькі ад цэнзуры і дыктату, але і ад самавольства ананімных правакатараў і злачынцаў.

***— Якая роля МФГС у стварэнні гуманітарнай прасторы СНД?***

— Ролю МФГС у стварэнні гуманітарнай прасторы СНД нельга разглядаць у адрыве ад ролі СГС, паколькі менавіта Савет вызначае тыя праекты і праграмы, фінансаванне якіх ажыццяўляе Фонд. Наўрад ці можна назваць хоць адзін праект або праграму, падтрымка якіх не апраўдала сябе. Даследаванне і захаванне гісторыка-культурнай спадчыны, падтрымка міжкультурнага дыялогу, стварэнне Сеткавага ўніверсітэта СНД, развіццё спорту — усе гэтыя і многія іншыя ініцыятывы толькі часткова задавальняюць запатрабаванні грамадзян нашых краін у сферы гуманітарнага супрацоўніцтва. Трэба рабіць у шмат разоў больш, прыцягваючы да гэтага і дзяржавы, і бізнэс, і грамадскасць. У Беларусі пры падтрымцы МФГС традыцыйна праходзіць Беларускі міжнародны медыяфорум «Партнёрства ў імя будучыні», які збірае медыяперсон і экспертаў з усёй Садружнасці і з многіх краін Еўропы. Гэта нейкі аналаг Форуму творчай і навуковай інтэлігенцыі ў рамках СНД, аднак нам удаецца надаваць адмысловую ўвагу рабоце з моладдзю. У рамках медыяфоруму штогод дзейнічае Летняя школа журналістыкі, пад эгідай Беларускага рэспубліканскага Саюза моладзі і Інстытута журналістыкі рэгулярна праводзяцца міжнародныя мерапрыемствы, прысвечаныя гуманітарнай тэматыцы. Зусім нядаўна, 15—16 лістапада гэтага года, сумесна з Пастаянным камітэтам Саюзнай дзяржавы мы правялі ў Гомелі першы беларуска-расійскі форум маладых журналістаў «Агульны погляд у будучыню». Улічваючы гэты досвед, думаю, у 2013 і 2014 гадах мы паспрабуем звярнуць асаблівую ўвагу на праекты, якія спрыяюць уцягванню моладзі ў жыццё СНД. Калі зможам стварыць сапраўдную Садружнасць маладых, значыць, зможам зрабіць нашы краіны бліжэй і забяспечыць перспектыву ўсім нашым пачынанням.

*Уважаемые акционеры!*
7 декабря 2012 г. в 15.00.
**СОСТОИТСЯ ОЧЕРЕДНОЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ**
**ОАО «БЕЛДОРТЕХНИКА».**
Место проведения: **г. Смолевичи, ул. Торговая, 14 «Б», актовый зал.**
Регистрация участников собрания — **с 14.30 до 15.00.**
**Повестка дня:**
1. О внесении изменений в Устав Общества.
УНП 100135303 *Администрация.*

**г. ВИТЕБСК** **31.12.2012**

**ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТОВ ГОСУДАРСТВЕННОЙ СОБСТВЕННОСТИ С ОДНОВРЕМЕННОЙ ПРОДАЖЕЙ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА**

| № лота | Наименование предмета аукциона | Характеристика предмета аукциона | Начальная цена предмета аукциона, рублей | Сумма задатка, рублей |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Неиспользуемое здание Дворца культуры машиностроителей с благоустройством и инженерными коммуникациями, расположенное по адресу: Витебская область, г. Орша, переулок 2-й Восточный, 19, и право заключения договора аренды земельного участка | Характеристика объекта недвижимости: **капитальное строение с инвентарным номером 240/С-29592** – здание специализированное культурно-просветительного и зрелищного назначения (Дворец культуры машиностроителей) с тамбуром, холодной пристройкой, общая площадь 1869,4 кв.м, 1965 года постройки, двухэтажное кирпичное, фундамент бутобетонный, перекрытия чердачные, дерево, крыша – совмещенная рулонная, оцинкованное железо; **капитальное строение с инвентарным номером 240/С-238871 –** сооружение специализированное энергетики, бронекабель протяженностью 102 м, **капитальное строение с инвентарным номером 240/С-238870** – сооружение специализированное коммунального хозяйства (фекальная канализация) протяженностью 4 м, **капитальное строение с инвентарным номером 240/С-238869 – сооружение специализипрованное коммунального хозяйства –** водопровод наружный протяженностью 19,2 кв.м, **капитальное строение с инвентарным номером 240/С-238868 –** сооружение специализированное коммунального хозяйства **–** цветник площадью 34 кв.м, **капитальное строение с инвентарным номером 240/С-238866 –** сооружение специализированное коммунального хозяйства, площадка асфальтная площадью 807 кв.м, **капитальное строение с инвентарным номером 240/С-238864 –** сооружение специализированное коммунального хозяйства **–** площадка, уложенная плиткой бетонной площадью 512 кв.м Земельный участок с кадастровым номером 242400000001012563, площадью 0,4841 га, для обслуживания Дворца культуры машиностроителей, сроком аренды 30 лет | **2 094 995 744** | **418 999 140** |

ОРГАНИЗАТОР – фонд «Витебскоблимущество», г. Витебск, ул. «Правды», 38, контактный телефон в Витебске: (0212) 476096, сайт www.fondgosim.vitebsk.by, e-mail: votfondgi@tut.by.

ПРОДАВЕЦ НЕДВИЖИМОСТИ: Министерство промышленности Республики Беларусь, тел. в Орше (0216) 31 41 42

Условия предоставления земельного участка**:** в течение двух месяцев со дня подписания договора аренды, но не позднее трех месяцев со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона продажи несостоявшимся, обратиться за государственной регистрацией прав, ограничений (обременений) прав на земельный участок.

В случае, если размер платы за земельный участок превышает 1000 базовых величин для граждан, 2000 базовых величин для индивидуальных предпринимателей, и 10000 базовых величин для юридических лиц, при желании получить рассрочку по внесению платы за земельный участок, в двухдневный срок со дня утверждения протокола о результатах аукциона обратиться в Оршанский городской исполнительный комитет с заявлением о предоставлении рассрочки.

**Аукцион состоится «31» декабря 2012 г. в 11 часов в здании фонда «Витебскоблимущество» по адресу: г. Витебск, ул. «Правды», 38.**

Для участия в аукционе приглашаются граждане, юридические лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, иностранные инвесторы, а также консолидированные участники – два и более субъекта малого предпринимательства – индивидуальные предприниматели и (или) микроорганизации. Участнику необходимо подать заявление и подписать соглашение установленной формы с фондом «Витебскоблимущество».

Лица, желающие принять участие в аукционе, к заявлению прилагают: заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка; а также представляются: юридическими лицами Республики Беларусь – доверенность, выданная представителю юридического лица, копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица, без нотариального засвидетельствования; индивидуальными предпринимателями – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранными юридическими лицами – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с нотариально удостоверенным переводом на белорусский (русский) язык; представителем индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юридического лица – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык. Иностранным гражданином или лицом без гражданства – документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованный в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия.

Консолидированными участниками для участия в аукционе к заявлению прилагаются: оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе; заверенная банком копия платежного поручения о перечислении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении; копии документов, подтверждающих государственную регистрацию индивидуальных предпринимателей и (или) микроорганизаций, заключивших договор о совместном участии в аукционе; сведения о средней численности работников микроорганизаций, заверенные подписью руководителя и печатью.

При подаче документов уполномоченное лицо (его представитель) предъявляют документ, удостоверяющий личность, и доверенности, выданные индивидуальными предпринимателями и (или) микроорганизациями, заключившими договор о совместном участии в аукционе. Представителем уполномоченного лица дополнительно предъявляется доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, либо документ, подтверждающий полномочия руководителя.

Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00, **последний день приема документов 28.12.2012 до 17.00** по адресу: г. Витебск, ул. «Правды», 38, кабинет 308. **Заключительная регистрация участников 31.12.2012 с 10.00 до 11.00**. К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.

1. Сумма задатка перечисляется до подачи заявления на участие в аукционе на расчетный счет № 3642903027026 в Региональной дирекции № 200 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369. Получатель – фонд «Витебскоблимущество», УНП 300002495.

2. Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и земельного участка в частную собственность или права заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Аукцион признается несостоявшимся, если заявление на участие подано менее чем двумя участниками, предмет аукциона не может быть продан по начальной цене. В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

3. Организатор аукциона вправе отказаться от проведение аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты его проведения.

**4. Участник, ставший победителем аукциона (претендентом на покупку), после окончания аукциона обязан:** подписать протокол аукциона; не позднее 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, расходы, связанные с формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, в том числе с государственной регистрацией в отношении этого участка; не позднее 12 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола заключить договор купли-продажи недвижимости и договор аренды земельного участка.

5. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектами продажи.

■ Нематэрыяльныя каштоўнасці

# КУЛЬТУРНЫ ШЫК ВЁСКІ

**У Доме культуры аграгарадка Касцюшкавічы Крычаўскага раёна спяваюць старадаўнія песні і робяць навамодных лялек, спалучаюць традыцыйнае і сучаснае. Увогуле вучаць вяскоўцаў адчуваць сябе культурнымі людзьмі.**



## Лапці і каралі

Фальклорны ансамбль «Добрасць» названы ў «гонар» мясцовай рачулкі. Аднак зносіны з яе ўдзельніцамі, мудрымі сялянкамі і шчырымі гумарысткамі, — гэта і ёсць сапраўдная добрасць.

— Напэўна, калі б адна дома сядзела, без танцаў, спеваў і сяброўак, даўно б памерла, — ці то жартуе, ці то ўсур'ёз кажа адна са спявачак.

Ансамбль складаецца з некалькіх жанчын ужо вельмі паважанага ўзросту, але да іх нядаўна далучылася і маладзіца. Марына Тарасава, бландзінка мадэльнага выгляду з шырокай усмешкай, стала мастацкай кіраўніцай ансамбля. Яна з павагай ставіцца да сваіх старэйшых каляжанак і вучыцца ў іх, але хоча адрозніваецца ад іх толькі ў адным: прыгажуня не мяняе свае модныя высокія абцасы на аўтэнтычныя лапці.

— А мне яны маладосць нагадваюць, я ў такіх яшчэ ў школу хадзіла, значна пазней у мяне туфлі з'явіліся, — дэманструе свае лапці адна з удзельніц.

Клятчатыя спадніцы, белыя кашулі з чырвонымі арнаментамі, яркія хусткі, каралі і завушніцы. У адной пацеркі з жэмчугу, у другой — вялізныя завушніцы з чырвонымі камянямі...

— Завушніцы гэтыя з Масквы, — хваліцца Зінаіда Захараўна Буракова. — Я люблю ўбірацца, упрыгожвацца. У святочныя дні — і ў будныя. Навошта хаваць свае скарбы ў шафах? Я з дзяцінства чырвоным алоўкам губы фарбавала. Жанчыне трэба быць прыгожай, так я адчуваю сябе жывой!

## Хлебна-мядовая соска

Але ўсё ж самае галоўнае ўпрыгажэнне — добры настрой. Праўда, жанчыны заводзяць песню разважлівую і нават сумную, але яны кажуць — «жыццёвую». Гучыць супакойліва, нібы мантра.



— Пражылі так, што рознае ў жыцці было: дзяцей малых гадавалі, кароў даілі, свякрові былі добрыя і ліхія, — расказвае Галіна Васільеўна Сцяпанава. — А цяпер вось добра жывём.

Ну, а беларуская песня расказвае пра жаночыя нягоды. «Першае гора (з крычаўскім памежным акцэнтам гучаць як горя. — **Аўт**.) — дзіця малое».

— О, раней «дэкрэтныя» не плацілі, а трэба было гадаваць дзяцей, працаваць і будавацца, — каментуюць цяпер ужо пенсіянеркі. — Не было калі ля калыскі стаяць.

— Дзіця кідала, бегала кароў даіць, на свякроў працадні пісала. І толькі калі трэцяга нарадзіла, тады ўжо сталі грошы мацеркам даваць.

— Соскі рабілі з хлеба, дадавалі мёд (цяпер сказалі б, што гэта добрая экалагічная і натуральная соска! — **Аўт**.), — расказвае Еўдакія Захараўна Сцефаненка. — Потым боршчыкамі троху харчавалі.

— Як гэта «нельга боршчыкам»? — пярэчыць мне жанчына. — Я чатырох выгадавала: ніхто не хварэў, усе добрыя!

## Ліхая свякроў, раўнівы муж

«Другое гора — свякроў ліхая».

— Свякроў нам заўсёды падказвала, як жыць і што рабіць, — узгадвае Кацярына Сяргееўна Семянкова. — Мы тады гэтага не разумелі, нас выпрабоўвалі на трываласць. А цяпер мы сваім нявесткам так жа сама падказваем...

— А я — добрая свякроўка, нявестка мяне любіць!

«Яшчэ адно гора — раўнівы муж».

— Памятаю, я кароў даю, а мой стаіць у калідоры — назірае, каб я ні з кім не размаўляла. Мы, даяркі, песні спяваем, навокал пастухі ходзяць, а нашы мужыкі нас «пасвяць»!

— Ой, а ў мяне ніякага гора няма! — усміхаецца мастацкая кіраўніца «Добрасці». — Мне мая праца падабаецца, і калектыў таксама. А так мне 18 гадоў, і я яшчэ не замужам!

У старадаўняй песні згадваюцца адны нягоды. А якія ж ёсць радасці ў жыцці жанчыны?

— А радасць такая: працуеш і думаеш, што хутка цябе паклічуць у клуб. Мой муж не раўнівы якраз быў, адпускаў куды хочаш. Радасны ўспамін, што была маладая і прыгожая. Радасць, што я пражыла добрае жыццё.

— А цяпер у мяне якое шчасце? — задумалася ўдава. — У пары б жыць, з дзедам.

— Я люблю папець і патанцаваць, але і папрацаваць: яшчэ працую ў бібліятэцы і санітаркай у ФАПе, — дадала Валянціна Анатольеўна Сідарава.

І ідуць жанчыны з «Добрасці», прытанцоўваючы, па сваім нялёгкім жыцці. І кажуць: жыццё адно, праляжыш яго на канапе — іншага не будзе.

## Глянцавая лаза

Нічога ў вобразе Людмілы Іванаўны Талпыгі, якая кіруе Домам культуры ў Касцюшкавічах, не нагадае вам пра сяло ў архаічным разуменні. Хутчэй яна выглядае як тыповая чытачка глянцавага жаночага часопіса: стройная жанчына, туфлі на абцасах, спадніца-аловак, ружовы світар, вытанчаны шалік.

Людміла Іванаўна штодня ездзіць з райцэнтра на працу ў Касцюшкавічы за рулём уласнага аўтамабіля. Яна любіць усё старадаўняе і інтэрнэт адначасова, не бачыць ніякай супярэчнасці ў мінулым і сучасным і лічыць, што для развіцця культуры трэба цікавіцца адразу ўсім.

— Сакрэт у тым, каб любіць жыццё і людзей, — гаворыць яна. — Я закахалася ў свае Касцюшкавічы. Пазнаёмілася з людзьмі. Мясцовыя бабулі — мае настаўніцы ў народнай творчасці! У нас тут шмат творчых дзяцей. Культура — гэта ўвогуле вельмі цікава. Хоць часам даводзіцца нават выхаваўчым працэсам займацца, каб стрымаць аматараў спіртных напояў. Такое наша жыццё.

**У Касцюшкавіцкім музеі знайшліся прыгожыя ўзоры для вышывання мастацкай гладдзю, якія друкаваліся ў пачатку 1960-х гадоў у сталічным выдавецтве «Звязда». Яны былі знойдзены ў час этнаграфічнай экспедыцыі ў вёсцы Юркаўка.**

У жыццё сельсавета імкліва ўварваліся камп'ютары. З аднаго боку, захоплівае ўсё электроннае і віртуальнае, з другога — хочацца рабіць нешта сваімі рукамі. Для такіх прыхільнікаў «хэндмэйду» існуе клуб аматараў ручной творчасці «Касцюшкі».

Сёння ў гэтым клубе хлопчык Цімафей і дзяўчынка Юля плятуць... з паперы. Шчыра кажучы, спачатку тут хацелі плесці з лазы, але яе цяжка нарыхтоўваць, ды і справіцца з гэтым матэрыялам нялёгка.

— Дзякуючы інтэрнэту знайшлася тэхніка папяровай лазы, — расказала Людміла Іванаўна. — Доўгія палоскі робяцца з паперы, і потым з іх пляцецца ўсё, што хочаш. Фантазія працуе на ўсю катушку.

Самае цікавае, што лаза атрымліваецца найбольш трывалай менавіта з глянцавых часопісаў. Але ёсць у касцюшкавіцкай калекцыі і кошык, зроблены з касавай стужкі, на якой друкуюць у краме чэкі!

## Капрон і лялькі

Па адукацыі дырэктар Дома культуры — мастак роспісу па дрэве, але цяпер яна вучыцца завочна ў Магілёўскім каледжы мастацтваў.

— У каледжы столькі адораных маладых людзей, што толькі з імі я звязваю далейшае развіццё культуры на вёсцы, — каментуе Людміла Талпыга. — Увогуле галоўнае ў маёй працы — шукаць таленавітых людзей, новыя творчыя ідэі.

З чаго толькі не робяць прыгожых лялек беларускія майстрыцы! Людміла Талпыга выбрала незвычайныя матэрыялы — сінтэпон і капрон.

— Была ідэя заняцца традыцыйнай лялькай, але вось гэта тэхніка, пра якую прачытала ў інтэрнэце, мяне захапіла! — прызнаецца дырэктар.

Людміла Іванаўна смяецца, што лішняга ў яе гаспадарцы нічога няма, бо нават калготкі (прабачце!) ідуць у важную справу стварэння арт-аб'ектаў.

Трэба шчыра сказаць, што гэтыя лялькі — ад вялікіх, у рост чалавека, да маленькіх, цацачных — не вельмі фотагенічныя. На здымках яны часам выглядаюць, нібыта персанажы мультыплікацыйных жахаў, хаця насамрэч даволі мілыя і прыемныя.

— У кожнай ляльки — свой характар, — паказвае майстрыха. — Вось гэта — дзелавая бабуля, з мудрасцю і вопытам, а гэта — дайце я пагляджу ўважліва! — плёткарка і нават скандалістка.

Людміла Іванаўна сцвярджае, што зрабіць такую лялькy нескладана. Пачынаць трэба з... галавы, а яшчэ больш дакладна — з носіка. Складкі робяцца з дапамогай крывой іголкі і нітак. А ўжо потым прышываюцца пацеркі замест вачэй (звычайна ярка-сінія) і робіцца адзенне з лепшых абрэзкаў. Майстар тут падобны да скульптара — лепіць лялечныя целы і характары, а потым іх апранае.

## Люстэрка часу

Гэтыя незвычайныя лялькі ўпрыгожваюць мясцовы музей. Ён зроблены ў сучасных пакоях Дома культуры, але стылізаваны пад сялянскую хату. На сапраўдным акне — жалюзі, а ў стылізаваным — белыя фіранкі з карункамі.

Вышыванкі з вёскі Пушкары: певень з рознакаляровым пер'ем і ружа на сінім фоне. Старажытнае люстэрка, у якім усё відаць нібыта скрозь заслону часу. Вельмі старая шафа з цёмнага дрэва з разьбой.





Наіўны малюнак кацянят у раме — папярэднік цяперашняга масавага захаплення «катэ» ў інтэрнэце. Іржавая падкова, што калісьці ахоўвала шчасце хаты і яе жыхароў.

У Касцюшкавіцкім музеі знайшліся і прыгожыя ўзоры для вышывання мастацкай гладдзю, якія друкаваліся ў пачатку 1960-х гадоў у сталічным выдавецтве «Звязда». У 1962 і 1963 годзе гэтыя лісты каштавалі 20 капеек. Сялянкі аформілі іх у карціны — яркія кветкі на чорным фоне, упрыгожылі вышыванымі ручнікамі. Узоры знойдзены ў час этнаграфічнай экспедыцыі ў вёсцы Юркаўка.

— Людзям, якія аддаюць нам у музей дарагія для іх рэчы, мы спяваем песні, частуем іх пірагамі, — расказвае Талпыга. — Але часам няма чаго запісаць пра іх гаспадароў: напрыклад, некаторыя з экспанатаў выбраны са смецця на гарышчы старой хаты...

Дарэчы, знаходзяць у Касцюшкавічах і нематэрыяльныя багацці. Напрыклад, старадаўні абрад з ужо зніклай вёскі. Там калісьці ў майстэрні рабілі колы для фурманак, і хлопцы каціілі іх па вёсцы. У які двор закоціцца — там будуць і шчасце, і дабрабыт. Гэтага ў Касцюшкавічах зычаць усім добрым і культурным людзям.

**Ілона ІВАНОВА. Фота аўтара.**
*Крычаўскі раён.*

| Даты | Падзеі | Людзі |
|---|---|---|

**1899** год — нарадзіўся (вёска Зазыбы, цяпер Віцебскі раён) Міхась Лынькоў, народны пісьменнік Беларусі (1962), акадэмік НАН Беларусі (1953). У 1931-41 гадах — галоўны рэдактар часопіса «Полымя рэвалюцыі». Быў арганізатарам і кіраўніком Бабруйскага філіяла «Маладняка», адным з кіраўнікоў Беларускай асацыяцыі пралетарскіх пісьменнікаў. У 1938-48 гадах — старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі. Працяглы час працаваў дырэктарам Інстытута мовы, літаратуры і мастацтва АН Беларусі. Аўтар кніг прозы «Гой», «Андрэй Лятун», «За акіянам», «Сустрэчы» і іншых. За раман-эпапею «Векапомныя дні» ўдастоены Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1968). Памёр у 1975 годзе.

**1874** год — нарадзіўся Уінстан Чэрчыль, брытанскі дзяржаўны і палітычны дзеяч, прэм'ер-міністр Вялікабрытаніі ў 1940-1945 і 1951-1955 гадах; ваенны, журналіст, пісьменнік, ганаровы член Брытанскай акадэміі (1952). У 1954 годзе ў Лондане Чэрчыль адсвяткаваў сваё 80-годдзе, а за год да таго ён стаў лаўрэатам Нобелеўскай прэміі па літаратуры за «высокае майстэрства ў гістарычным і біяграфічным жанрах і за выдатныя дасягненні ў прамоўніцкім мастацтве». Ушаноўваць палітыка і літаратара сабраліся прадстаўнікі ўсіх брытанскіх палітычных партый. Гаворачы пра свой уклад у перамогу над нацызмам, Чэрчыль сціпла сказаў: «Я не бачу тут сваёй асаблівай заслугі. Яна цалкам належыць нашай вялікай нацыі, прадстаўнікі або нашчадкі якой жывуць ва ўсіх кутках свету. Гэта ў іх грудзях палае львінае сэрца, а мне толькі выпаў гонар выдаваць ільвіны рык».



**1950** год — нарадзіўся Рыгор Рыгоравіч Ганчарэнка, беларускі вучоны ў галіне папуляцыйнай і эвалюцыйнай генетыкі, генетыкі лясных культур, член-карэспандэнт НАН Беларусі (1996), доктар біялагічных навук, прафесар. Асноўныя працы ў галіне генетыкі лясных драўняных культур, генетыкі прыродных папуляцый жывёл і раслін, эвалюцыйнай і радыяцыйнай генетыкі. На аснове распрацаванай тэст-сістэмы правёў ацэнку ступені пашкоджання спадчыннага матэрыялу ў выніку аварыі на ЧАЭС. Пад яго кіраўніцтвам выкананы комплексныя даследаванні, накіраваныя на захаванне, рацыянальнае выкарыстанне і ўзнаўленне генетычных рэсурсаў найважнейшых лесаўтваральных відаў Беларусі і сумежных дзяржаў. Пабудаваў генетычныя карты для соснаў і елак Усходняй Еўропы. Аўтар больш як 250 навуковых прац, у тым ліку 20 манаграфій і навучальных дапаможнікаў, 2-х вынаходстваў.

**Было сказана**

**Уладзімір Караткевіч (1930—1984), пісьменнік, паэт, публіцыст:**

*«Наконт таго, ці шмат здолее адзін. Нават адзін здолее, калі ідзе да канца».*

# Кран упаў на аўтамабілі

**У Лагойскім раёне адбылося незвычайнае здарэнне — кран упаў на прыпаркаваныя легкавыя аўтамабілі. Ёсць пацярпелыя...**

Гаворка ідзе пра кран грузападымальнасцю 25 тон на базе шасі «МАЗ». Адбылося гэта ў ААТ «Харошае», якое размешчана ў вёсцы Засоўе. У сярэдзіне працоўнага дня гэтая махіна завалілася на левы бок. Аўтакран упаў на два прыпаркаваныя легкавыя аўтамабілі. У «Рэно-Меган», на шчасце, нікога не было, а вось у «Сітраене» знаходзіліся два чалавекі. Абодва яны пацярпелі. Работнікі прадпрыемства пры дапамозе іншага грузападымальнага крана дасталі з транспартнага сродку сваіх калег і перадалі брыгадзе хуткай медыцынскай дапамогі. Адзін з пацярпелых быў дастаўлены ў бальніцу ў цяжкім стане. Стан другога пасажыра здавальняючы. Папярэдне мяркуецца, што кран упаў падчас замены ўнутранага кола задняй восі з правага боку.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ВЯЛІКІЯ І МАЛЕНЬКІЯ РЭКОРДЫ ВІКТОРЫІ АЗАРАНКІ

**Напрыканцы кастрычніка тэнісісткі традыцыйна адпраўляюцца на канікулы. Але перад гэтым збіраюцца на выніковым турніры, дзе вызначаюць лепшую тэнісістку сезона. Сёлета пераможцай чэмпіянату стала алімпійская чэмпіёнка Лондана Сірэна Уільямс. Але, нягледзячы на фенаменальнае выступленне амерыканкі ў другой палове сезона, дабрацца да першага радка сусветнай класіфікацыі ў яе не атрымалася. На вяршыні тэніснага алімпу сезон завяршыла Вікторыя Азаранка.**



На выніковым турніры Вікторыі дастаткова было атрымаць толькі дзве перамогі, каб абараніць званне першай ракеткі свету. Беларуская тэнісістка справілася з праграмай мінімум і тым самым упісала сваё імя ў гісторыю тэніса.

Вядома, Азаранка ўжо не раз ставіла і абнаўляла ўласныя рэкорды. Аднак усе яны былі нацыянальнага маштабу. У мінулым сезоне беларуска дабралася да трэцяй пазіцыі ў рэйтынгу, пабіўшы рэкорд Наталлі Зверавай, якая ў свой час была пятай ракеткай планеты. А ўжо ў самым пачатку 2012 года Віка літаральна ашаламіла ўвесь тэнісны свет, выйграўшы свой першы тытул Вялікага шлема ў Аўстраліі. Ды яшчэ дзякуючы гэтай перамозе стала першым нумарам планеты ў жаночым тэнісе. Дарэчы, гэта толькі трэці падобны выпадак.

Але, як аказалася, Вікторыя толькі набірала ход. На двух наступных турнірах яна таксама не ведала паражэнняў. З пачатку сезона і ажно да канца сакавіка беларуска мела бяспройгрышную серыю з 26 матчаў, пакуль не саступіла Марыён Барталі ў Маямі. Гэты вынік таксама ўвайшоў у гісторыю, стаў шостай па працягласці пераможнай серыяй у жаночым тэнісе.

Потым былі не вельмі ўдалыя выступленні на грунце, а вось на лонданскай траве зорка Азаранкі зноў заззяла. Спачатку Вікторыя дайшла да паўфінала Уімблдона, а месяцам пазней заваявала для сваёй краіны два медалі на Алімпійскіх гульнях — «бронзу» ў адзіночным разрадзе і «золата» ў міксце з Максімам Мірным. І зноў гэтыя вынікі нельга не назваць гістарычнымі. Па-першае, беларускія тэнісісты сталі першымі алімпійскімі чэмпіёнамі па тэнісе ў разрадзе змешаных пар. Па-другое, Вікторыя здабыла першы для айчыннага тэніса алімпійскі медаль у «адзіночцы» (у 1992 г. у складзе аб'яднанай каманды СНД бронзавай прызёркай Алімпіяды ў пары станавілася Наталля Зверава. — **Аўт**.). У тыя памятныя хвіліны, гледзячы на шчаслівую Вікторыю, якая стаяла на алімпійскім п'едэстале, не заставалася ніякіх сумненняў: менавіта гэтыя перамогі, а нават не трыумф у Аўстраліі, самыя важныя ў кар'еры беларускі.

Усё сваё юнацтва Віка правяла ў ЗША, дзе, па вялікім рахунку, і сфарміравалася як прафесійная тэнісістка. На той момант нельга было ўявіць, што ў Беларусі можна ўзгадваць тэнісістку экстра-класа — лепшую на планеце. Што і казаць: пра гэта і зараз разважаць складана. Але шчыра любіць тэніс і самаадданa працаваць Віку навучылі менавіта ў Беларусі, за што спартсменка неаднаразова выказвала словы падзякі сваім першым трэнерам. Вядома, вялікая занятасць не дазваляе Вікторыі часта бываць дома. Аднак і ў гэтыя рэдкія моманты яна паспявае праводзіць майстар-класы для выхаванцаў Палаца тэнісу, у сценах якога калісьці маленькай дзяўчынкай марыла аднойчы стаць першай ракеткай свету.

Зараз яна завяршыла тэнісны сезон на першым радку рэйтынгу, што ўдалося толькі адзінаццаці тэнісісткам. Ды яшчэ і набрала рэкордную колькасць балаў за адзін сезон (больш 10 000)! Але, улічваючы малады ўзрост, талент і амбіцыі Вікторыі, можна не сумнявацца, што гэта не апошняе дасягненне, якое запісвае на свой рахунак беларуская тэнісістка.

**Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ.**

## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск | — 9.04 | 16.53 | 7.49 |
| Віцебск | — 9.00 | 16.35 | 7.35 |
| Магілёў | — 8.54 | 16.42 | 7.48 |
| Гомель | — 8.42 | 16.47 | 8.05 |
| Гродна | — 9.18 | 17.09 | 7.51 |
| Брэст | — 9.11 | 17.18 | 8.07 |

**Месяц**

***Поўня 28 лістапада. Месяц у сузор'і Рака.***

**Імяніны**

***Пр.*** *Лазара, Міхаіла, Нікана, Рыгора, Сяргея.*
***К.*** *Канстанцыі, Маўры, Юстыны, Андрэя, Канстанціна, Людаслава.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА





## УСМІХНЕМСЯ

Хочаш адпомсціць мужу? Навядзі парадак у яго гаражы!

**Раніца. Сняданак. За сталом мужчына і жанчына. Ён:**

**— Зрабі мне бутэрброд з маслам і ікрой.**

**Яна акуратна намазвае ўсё на хлеб. Ён з'ядае. Праз пару хвілін:**

**— Зрабі яшчэ!**

**Яна:**

**— Не буду. Гэта была дэманстрацыйная версія клапатлівай жанчыны. Ліцэнзійную версію ты зможаш набыць толькі пасля рэгістрацыі шлюбу.**

Фразай «гусь свінні не таварыш» індык справакаваў бойку хлеў на хлеў.

**— Навошта табе спірт?**
**— Струны праціраць.**
**— Якія струны?!**
**— Струны душы!**



caricatura.ru


ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. КАРПЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: rek@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 26.520. Індэкс 63850. Зак. № 5308.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 29 лістапада 2012 года.